# Лявончыкаву Васілю Емельянавічу – 75

27 мая адзначыў свой юбілей Васіль Емельянавіч Лявончыкаў – доктар педагагічных навук, прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, акадэмік Міжнароднай акадэміі інфарматызацыі пры ААН (г. Масква), член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі.

У 1962 г., маючы ўсяго 25 гадоў, Васіль Емельянавіч атрымаў запрашэнне выкладаць на бібліятэчным факультэце Мінскага педагагічнага ўніверсітэта імя А.М. Горкага. Удумлівага, разумнага, здольнага да навуковай працы выпускніка факультэта вызначыў тагачасны загадчык кафедры бібліяграфіі, дацэнт М.Ц. Талкачоў і пераканаў заняцца навукова-педагагічнай дзейнасцю. З таго часу лёс Васіля Емельянавіча звязаны з прафесійнай падрыхтоўкай бібліятэкараў-бібліёграфаў, нацыянальных навукова-педагагічных кадраў у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці. Малады выкладчык з адметнай настойлівасцю і захапленнем распрацоўваў і чытаў спецыяльныя вучэбныя дысцыпліны, паспяхова выконваў абавязкі намесніка дэкана бібліятэчнага факультэта. У хуткім часе ён пачаў навучанне ў аспірантуры Маскоўскага дзяржаўнага інстытута культуры, дзе пад кіраўніцтвам выдатнага бібліяграфазнаўца, прафесара А.Д. Эйхенгольца напісаў і паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Общая ретроспективная библиография книг Беларуси: история и теоретические вопросы» (1969 г.). Гэта першае грунтоўнае навуковае даследаванне па праблемах нацыянальнай рэтраспектыўнай бібліяграфіі. У 1971 г. дацэнт В.Е. Лявончыкаў быў прызначаны дэканам бібліятэчнага факультэта спачатку ў Мінскім педагагічным універсітэце імя А.М. Горкага, а ў 1975 г. – у Мінскім інстытуце культуры. У 1983 г. Васіль Емельянавіч абіраецца прафесарам кафедры бібліяграфіі і яе загадчыкам. Ён працуе над доктарскай дысертацыяй «Система библиографической информации союзной республики: теоретико-методологические проблемы», якую паспяхова абараніў у Маскоўскім дзяржаўным інстытуце культуры (1988 г.). Пасля стварэння ў Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый В.Е. Лявончыкаў узначальваў яе каля 20 гадоў. Вялікая педагагічная работа, распрацоўка шматлікіх вучэбных дысцыплін, адказныя адміністрацыйныя і грамадскія абавязкі не перашкаджалі Васілю Емельянавічу сістэматычна займацца навуковай работай. Ён апублікаваў каля 200 прац, сярод якіх манаграфіі: «Беларуская рэтраспектыўная бібліяграфія кніг» (1971), «Система библиографической информации союзной республики: история, современное состояние, проблемы» (1990), два выданні падручніка «Беларуская бібліяграфія. Агульны курс» (1983, 1991), першыя ў Беларусі прафесіянальныя слоўнікі: «Русско-белорусский словарь библиотечных и библиографических терминов» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка, 1992) і «Тлумачальны слоўнік бібліятэчных і бібліяграфічных тэрмінаў» (у сааўтарстве з Л.А. Дзямешка і Р.І. Саматыя, 2000), дзесяткі навуковых артыкулаў і інш.



Навуковыя інтарэсы В.Е. Лявончыкава вельмі шырокія і заўжды былі накіраваны на асэнсаванне трансфармацый бібліяграфіі і бібліятэчнай справы ў адпаведнасці з патрабаваннямі грамадства. Адметныя рысы ўсіх яго прац – грунтоўнасць метадалагічнай і фактаграфічнай асновы, дакладнасць даследчых мэтаў і сістэмы навуковай аргументацыі, тэарэтычная і практычная навізна і значнасць. Нават у дыскусіях па праблемах бібліяграфазнаўства канца XX – пачатку XXI ст., у якіх кардынальна змяняліся погляды на сутнасць бібліяграфіі і яе грамадскую ролю, выказванні В.Е. Лявончыкава вызначаліся глыбінёй навуковай эрудыцыі і ўзважлівасцю.

Неацэнны ўклад вучонага ў гісторыю айчыннай бібліяграфіі – ён стаў заснавальнікам гэтай навуковай дысцыпліны. Праблемы сучаснага стану беларускай бібліяграфіі, яе асобных відаў, бібліятэчнай адукацыі, інфармацыйнай культуры і іншыя знаходзяцца ў прадметным полі яго навуковай творчасці. Асабліва вабяць В.Е. Лявончыкава тэарэтыка-метадалагічныя праблемы бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства, якія вызначаюць у рэшце рэшт мадэлі ўпраўлення ў бібліятэчнай справе, з'яўляюцца надзейным інтэлектуальным элементам усёй практычнай дзейнасці.

Выдатны навуковы патэнцыял вучонага ярка ўвасобіўся ў створанай ім навуковай школе ў вобласці бібліяграфазнаўства, бібліятэказнаўства і кнігазнаўства, прадстаўнікі якой абаранілі кандыдацкія дысертацыі і плённа працуюць у Беларусі і за мяжой у галіне бібліятэчна-інфармацыйнай дзейнасці і іншых сферах. Сёння пад яго кіраўніцтвам вядуць навуковыя даследаванні аспіранты і магістранты факультэта інфармацыйна-дакументных камунікацый.

Васіль Емельянавіч у апошнія гады вывучае праблемы бібліятэчнай камунікацыі як стратэгічнага кірунку ўзаемадзеяння бібліятэкі і грамадства, ролі бібліятэк у сістэме бесперапыннай адукацыі.

Значнае месца ў жыцці юбіляра займаюць грамадскія абавязкі. Ён з'яўляецца членам вучонага савета і Савета факультэта, членам рэдкалегіі «Веснiка БДУ культуры і мастацтваў». Шмат гадоў В.Е. Лявончыкаў быў намеснікам і галоўным рэдактарам міжведамаснага зборніка «Пытанні бібліяграфазнаўства і бібліятэказнаўства», з'яўляўся членам рэдкалегіі часопіса «Бібліятэчны свет», тэматычных навуковых зборнікаў. Вучоны ўнёс вялікі ўклад у стварэнне грамадскай арганізацыі бібліятэчных спецыялістаў – Беларускай бібліятэчнай асацыяцыі, першым прэзідэнтам якой ён быў на працягу 1992–1993 гг., а зараз з'яўляецца ганаровым членам гэтай арганізацыі. Яго імя ўключана ў слоўнік «2000 Outstanding Scientists of the 21st Century» (Cambridge, 2005) Міжнароднага біяграфічнага цэнтра ў Кэмбрыджы, у даведнік «Кто есть кто на академическом Олимпе» (Москва, 2004) Міжнароднай Акадэміі інфарматызацыі пры ААН.

За навукова-педагагічную дзейнасць В.Е. Лявончыкаў узнагароджаны ордэнам СССР «Знак Почета», медалямі «За доблестный труд», «В ознаменование 100-летия со дня рождения Владимира Ильича Ленина», «Ветеран труда», нагрудным знакам Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь «За ўклад у развіццё культуры Беларусі», Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь і інш. Васіля Емельянавіча звязваюць сяброўскія і прафесійныя стасункі з выдатнымі вучонымі і практыкамі нашай краіны і замежжа.

Мы, яго калегі і вучні, адрасуем юбіляру шчырыя віншаванні і пажаданні новых навуковых здзяйсненняў, таленавітых вучняў, добрага здароўя і настрою!

*Вера Касап,*
*прафесар, загадчык кафедры тэорыі і гісторыі інфармацыйна-дакументных камунікацый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

*Валянціна Саітава,*
*дацэнт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ